# Алімпіядныя заданні для 8 класа

1. *Расстаўце націскі ў словах:*
   аер, атлет, азбест, агент, адзінаццаць, беларусы, буйны, бульбяны, вярба, велізарны, выпадак, жыхар, імя, каменны, крапіва, крыху, накрыўка, некаторы, паведаміць, пакутаваць, стары, таварышы, фурманка, цяжкі, цяжар, чатырнаццаць, шэсцьдзесят.
2. *Запішыце словы, якія вымаўляюцца*
   \ атс'ул'\, \ б'ароска\, \ л'охка\, \л'уцк'і\, \ п'ашчаны\, \ проз'ба\, \ п'эраклаччык\, \ пытай'эс'с'а\,
   \ хвой'а\.
3. *Складзіце сказы, каб прыведзеныя спалучэнні слоў ужываліся як свабодныя і як устойліаыя ( фразеалагізмы ):*
   стаць на ногі, па галоўцы гладзіць, стаяць на шляху, доўгая песня, закінуць вуды.
4. *Выпішыце прыслоўі і размяркуйце на групы паводле спосабу ўтварэння.*
   1. Зімой і летам адным цветам. 2. Жураўлі ляцяць нізка – зіма ўжо блізка. 3. Сей смела, калі ў садзе бела. 4. Хто ўлетку спіць, той узімку не есць. 5. Дзе пасееш густа, там не будзе пуста. 6. Пайшоў нацяняькі – хадзіў тры дзянькі. 7. Прама варона лятае, ды дома не начуе. 8. Пешкі няма замешкі.
5. *Выпішыце сказы з памылковым ужываннем дзеепрыслоўяў, выпраўляючы памылкі. Растлумачце памылкі.*
   1. Чытаючы аповесць А. Адамовіча "Карнікі", сціскаецца сэрца. 2. Дзед, не спяшаючыся, дастаў люльку. 3. Не адказваючы, брыгадзір пайшоў у кантору. 4. Забіўшы паліцая, Сотнікава самога параніла. 5. Над ракою, тушачы маланкі ў вадзе, плывуць хмары. 6. Падыходзячы да школы, мне не стала цяплей. 7. Наўкола, чакаючы, сядзелі хлопцы. 8. З лётчыкам Куніцыным, лятаючы на самалёце, здарылася аварыя. 9. Развітваючыся з маці , у мяне моцна забілася сэрца. 10. Ларывон хацеў яшчэ нешта сказаць, але, зірнуўшы на Яўхіма, прамаўчаў.
6. *Размяркуйце назоўнікі паволле родавай прыналежнасці.*
   Раяль, памідор, карусель, бандэроль, ААН, сірата, танга, бра, Гродна, мовазнаўца, Малдова, недарэка, лэдзі, запявала, гарэза, Тбілісі, таксі, заіка, фае, ложак, сабака, медаль, боль, шымпанзэ, шоу, пола, журы, плакса, місіс, БДУ, таполя, пыл, гусь, шынель, жаль, кава, брыво, цень.
7. *Вызначце памылку ў словазлучэннях, запішыце прввільныя варыянты.*
   З шклянкі, пайсці за чарніцамі, ехаць за сенам, ажаніўся на Алене, насміхацца над сябрам, жартаваць над суседкай, ісці за хлебам, пайсці на буракі, вышэй яе, дзякаваць яго, дараваць брата, выбачаць сябра, хварэць грыпам, сумаваць па родным, не пайшоў з-за хваробы, пранікаць сквозь фіранкі, у метрах васьмі ад станцыі, дасылаць па адрасу, зайшоў за дзецьм
8. *Складзіце і запішыце са словамі сказы так, каб у першым выпадку*

*гэтыя словы былі прыназоўнікамі, а ў другім – дзеепрыслоўямі.*

Выключаючы, пачынаючы з, нягледзячы на.